ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 43 (425) Пятніца, 15 красавіка 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню У СЕРАДУ, ПЯТНІЦУ І НЯДЗЕЛЮ | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 23.

Пленум Менскага АК ЛКСМБ

16-га красавіка г. г. склікаецца чарговы пленум Менскага АК ЛКСМБ з наступнай абвесткай дню: 1) Аб пастановах 5-й усесаюзнай конфэрэнцыі УЛКСМ (Бараньнікаў). 2) Вынікі ўдзелу організацыі ў перавыбарах сельсавету і далейшая праца ў саветах (Рубін). 3) Аб формах конкрэтнага кіраўніцтва (Шаліма). 4) Праца сярод парабкаў на лета (Шнэйдэр). 5) Аб летняй культурна-масавай рабоце (Казанаў. 6) Бягучыя пытаньні.

За дзень да пленуму адбудзецца нарада сакратароў райкомаў.

Зацьвярджэньне констытуцыі

(З перадавіцы газэты ЦК КП(б)Б „Звезда“).

Зацьвярджэньне 8-ым усебеларускім зьездам саветаў констытуцыі БССР ёсьць акт вялікага політычнага значэньня.

Констытуцыя адбівае ўзаемаадносіны клясаў у нашай краіне, сутнасьць нашай дзяржавы, соцыялістычныя мэты нашага будаўніцтва і шляхі вырашэньня нацыянальнага пытаньня ў БССР.

Констытуцыя СССР дае поўныя магчымасьці для экономічнага і культурнага разьвіцьця ўсіх раней прыгнечаных пры царызьме народаў і краін, у тым ліку і нашай Беларусі. Нацыянальная політыка савецкай улады дапамагла ў нас уздыму культурнага ўзроўня насельніцтва, палепшаньню экономічнага становішча і народнай гаспадаркі нашай рэспублікі. Наша далейшае разьвіцьцё, магчымасьці мірнага будаўніцтва соцыялізму забясьпечваюцца для нас прыналежнасьцю да вялікага СССР, які абараняе нас ад капіталістычнага сьвету.

І зноў жа нашы ворагі ўсе свае пляны наконт нашага паслабленьня будуюць на нібы існуючай процілегласьці інтарэсаў паасобных савецкіх рэспублік. Вось, напрыклад, газэта „Кур'ер Віленскі“ марыць аб конфлікце паміж Украінай, Беларусьсю і Масквой і спадзяецца, што Польшча тады выканае „вялікую гісторычную ролю. Паколькі яна на працягу вякоў была ворагам Масквы, Польшча павінна будзе зрабіцца саюзьніцай Украіны і Беларусі“. Калі аўтары гэтага артыкулу былі-б на пасяджэньні беларускага зьезду саветаў у тэй час, як тав. Крыніцкі цытараваў гэтыя радкі ў сваёй прамове, і чулі-б той гучны сьмех, якім адказаў на гэты зьезд, яны тады можа зразумелі-б усю недарэчнасьць і глупства сваіх мар.

Беларускія працоўныя масы ня думаюць аб новых саюзьніках, апроч тых, якіх яны маюць у васобе савецкіх рэспублік і ўсяго Савецкага Саюзу. Беларускія рабочыя і сяляне добра ведаюць, як адчуваюць сябе іх заходнія браты ў лапах польскіх „саюзьнікаў“.

Адно з пытаньняў, якое знашло сабе адбітак у нашай констытуцыі, гэта—нацпытаньне, тое пытаньне, якое савецкая улада вырашыла так, як ня можа яго вырашыць ніводная буржуазна-дэмократычная дзяржава.

У нас забясьпечаны магчымасьці разьвіцьця для ўсіх народаў нашай рэспублікі. У нашай констытуцыі мовы чатырох галоўных народаў нашай краіны: беларуская, яўрэйская, расійская і польская лічацца дзяржаўнымі. І толькі маючы на ўвазе пераважны лік беларускага насельніцтва, констытуцыя абвяшчае беларускую мову моваю пераважных зносін між установамі і організацыямі. Але ў тэй жа час кожнаму грамадзяніну забясьпечваецца права карыстаньня роднай мовай і абслугоўваньне яго роднай мове.

Трэба адзначыць, што побач з раўнапраўем усіх нацыянальнасьцяў нашай рэспублікі, лёзунг інтэрнацыялізму, інтэрнацыянальнай міжнароднай барацьбы пролетарыяту за вызваленьне працоўных усяго сьвету зьяўляецца адным з галоўнейшых прынцыпаў нашай констытуцыі.

Тая дэмонстрацыя брацтва народаў БССР і іх шчыльнай сувязі з СССР, што мы бачылі і чулі на зьезьдзе усё гэта паказвае, што зацьвярджэньне констытуцыі сапраўды зьяўляецца вялікім гісторычным актам 8-га ўсебеларускага зьезду саветаў.

Бойкі ў Кітаі цягнуцца

Ангельцы пакідаюць кітайскія кварталы

Англія рыхтуецца да абкружэньня кантонскіх прыстаняй

Ангельская газэта піша, што ангельскі ўрад яшчэ не рашыў, што ён будзе рабіць, калі кітайскі нацыянальны ўрад не захоча выканаць патрабаваньняў Англіі. Пакуль што абгаварваюцца прапановы аб заняцьці ангельскім войскам фартоў (марская крэпасьць) Вузуна (недалёка ад Шанхаю) і ваеннага абкружэньня ўсіх прыстаняй, якія знаходзяцца ў руках кантонцаў.

Апошнія портрэты Чжа-Цзо-Ліна

I.



II.



Парад Шанхайскіх рабочых дружын


У Шанхай адбыўся парад рабочых дружын. У парадзе бралі ўдзел 1.500 рабочых, убраных у новую сінюю форму (з кукардамі агульнага гаміндануаўскага ўзору, але на звычайным белым фоне прымацаваны серп і молат.

Далейшы наступ нацыянальнай арміі

Водлуг паведамленьняў друку нацыянальнае войска ў провінцыі Аньхой атакуе чыгуначную лінію Пукоў-Пенну ў пунктах Пукоў-Вуйі-Чучжоў і Пенну. Захапіўшы Цінгівэн, нацыянальнае войска наступае далей на Фынь-Ян. Ворагі выводзяць галоўныя сілы ў раён Сючжоў (на паўночным заходзе кутка провінцыі Цзянсу) для абароны якога, згодна пастановы конфэрэнцыі генэралаў, будуць ужыты ўсе захады.

Выезд ангельцаў з кітайскай часткі Кантону

Ангельцам, якія жывуць у кітайскай часты Кантону, дадзены загад выбрацца і пераехаць у Шамін (міжнародны квартал Кантону) ці Ганкоў.



Памяшканьне кітайскага рабочага ў плывучай «Самары».

Гаспадар зямлі беларускай— восьмы ўсебеларускі зьезд саветаў.

Дзяржаўны гэрб БССР, зацьверджаны VIII Усебеларускім Зьездам Саветаў.



Гэрб Беларускай Соцыялістычнай Савецкай Рэспублікі складаецца з наступных частак:

Серп і молат, зьмешчаныя крыж-на-крыж—сымбаль працы і сувязі рабочых і сялян.

Усходзячае сонца, якое сваімі праменьнямі асьвятляе серп і молат—сымбаль распаўсюджаньня ўлады працоўных на ўвесь сьвет.

Частка зямной кулі, з уключэньнем тэрыторыі БССР, як часткі Саюзу ССР.

Пяцёхканцовая чырвоная зорка—сымбаль сусьветнага соцыялізму.

Вянок, які абкружае вышэй паказаныя часткі, мае ў левай палове каласы жыта—сымбаль сельскай гаспадаркі, і канюшыну—сымбаль інтэнсыфікацыі сельскай гаспадаркі, а ў правай палове дубовыя галіны—сымбаль лясного багацьця БССР.

Чырвоная істужка, якой перавіты абедзьве паловы вянка, мае надпісы на ёй на чатырох мовах (беларускай, яўрэйскай, расійскай і польскай) „пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся“ і ініцыялы „БССР“. Характар шрыфту беларускай мовы часткова ў стылю СКАРЫНЫ.

Прамені сонца, якое ўсходзіць з-за зямной кулі, невялікімі прамежкамі падзелены на 7 аднолькавых пучкоў. 7 пучкоў адзначаюць тое, што дзяржаўны гэрб зацьвярджаецца ў 7-ю гадавіну замацаваньня савецкае ўлады ў БССР пасьля вызваленьня яе ад польскіх акупантаў.

Аб становішчы гарадоў Беларусі і гарадзкім будаўніцтве.

Даклад намесьніка старшыні тав. Карнліна

Гарады, зазначыў дакладчык, пасьля рэволюцыі вырасьлі і набылі важнае значэньне ня толькі, як політычныя, але як культурныя і экономічныя цэнтры. У гарадох Беларусі, у асобку ў Менску, за час рэволюцыі зьявіўся вялікі лік новых культурных, экономічных і іншых організацый і прадпрыемстваў, якія патрабуюць вялікай плошчы. Яшчэ ў большай ступені патрабуе гэтага рост рабочай сілы ў гарадох, выкліканы з аднаго боку, ростам прамысловасьці, а з другога—прытокам беспрацоўных з вёскі. Між тым, становішча гарадоў Беларусі ў выніку вайны і акупацый вельмі цяжкае. Шмат гарадоў было часткова зруйнавана. Комунальныя прадпрыемствы часткаю пазношваліся; вадаправоды папсаваны; асьвятленьне слабое; зруйнаваны мясцовыя прадпрыемствы; доўгі час ня было пераправы, бо масты паламаны; гарады—у антысанітарным становішчы.

Кватэрны крызіс

Зараз гарады Беларусі адчуваюць востры кватэрны крызіс. У акруговых гарадох на душу жыхарства прападае 12,7 квадратных аршын, замест нармальных 16-ці. У раённых гарадох становішча яшчэ горшае.

Толькі сёлета распачаўся перэлом у кватэрным камунальным будаўніцтве. Аднаўленьне жылой плошчы адбываецца досыць шпаркім тэмпам. За апошнія 2 гады выдаткі на аднаўленьне павялічыліся амаль што ў тры разы і дасягнулі сёлета 5.200.000 рублёў.

Аднак, пры самым шпаркім тэмпе аднаўленьня ў 1930 годзе плошча на душу жыхарства яшчэ зьменшыцца ў параўнаньні з сучасным і будзе складаць 11,6 квадратных аршын, бо да гэтага часу зношваецца кватэрная плошча значна шпарчэй, чымся расьце. Гарады-ж, апроч натуральнага росту, маюць яшчэ вялічэзны прыток жыхарства.

За мінулыя гады некаторыя гарады БССР павялічыліся на 45 проц. Кватэрны крызіс павялічвае таксама крызіс дабрабыту. Ні ў адным горадзе Беларусі няма каналізацыі. Неабходна адрэмантаваць, а таксама пабудаваць у некаторых гарадох вадаправоды. Гарадзкія электрычныя станцыі перагружаны, іх неабходна пашырыць, на што патрэбна ў працягу 5 гадоў блізка 22 мільёнаў рублёў. Вялічэзныя сродкі патрэбны таксама на пабудову школьных памяшканьняў, больніц і іншых грамадзкіх установаў, якія за 5 гадоў павінны пашырыцца на 40 проц., каб здаволіць мінімальныя патрэбы.

Вялікім недахопам у будаўніцтве зьяўляецца яго дарагоўля. Зараз пабудова каштуе на 150 проц. даражэй мірнага часу. Таксама дае сябе моцна адчуваць нізкая якасьць будаўніцтва.

Мэрапрыемствы ў пашырэньні будаўніцтва

Дзеля пашырэньня будаўніцтва і ўцягненьня шырокіх мас у кватэрную коопэрацыю гарсавет надаў шырокія магчымасьці і правы ініцыятывы кватэрнай коопэрацыі: пашыраюцца палёгкі па пазыку, намячаецца выданьне кватэрнага кодэксу, павялічваецца барацьба са зруйнаваньнем кватэрнай плошчы, ужываюцца практычныя захады да патаненьня будаўніцтва і палепшаньня яго якасьці.

База для індустрыялізацыі ёсьць.

Задача індустрыялізацыі Беларусі стаіць асабліва востра і павінна праводзіцца хутчэй, чым у іншых раёнах. База для гэтага ёсьць. Беларусь мае багатыя энэргетычныя рэсурсы—велізарныя тарфяныя залежы, вадзяную энэргію, велізарную колькасьць сельска-гаспадарчае сыравіны, лясныя рэсурсы і выкапні, якія магчыма скарыстаць у керамічнай, шкляной і цэмантнай прамысловасьці.

Разьвіцьцё прамысловасьці патрабуе таксама лішкі рабочых рук, у зьвязку з перанаселенасьцю.

У разьвіцьці беларускае прамысловасьці асабліва зацікаўлена сялянства, бо гэта разьвіцьцё ўвязваецца з разьвіцьцём і рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі, павялічэньнем таварнасьці яе. Ужо зараз беларуская прамысловасьць, 65 проц. патрэбнае ёй сыравіны, бярэ з мясцовага рынку.

У бліжэйшыя пяць год індустрыялізацыя Беларусі пойдзе шпаркім тэмпам.

Пабудова новых прадпрыемстваў.

Згодна пяцігадовага пэрспэктыўнага пляну на пабудову новых прадпрыемстваў і пашырэньне старых, будзе выдаткавана 108 мільёнаў на дзяржаўнай прамысловасьці і 14 мільёнаў на мясцовай. Будуць пашыраны дрэваапрацоўваючая, папяровая, запалачная, мэталічная, тэкстыльная і харчовая прамысловасьці. Нанова організуюцца цэмэнтная, этэрнітавая, фаянсавая, алюмінёвая, фасфарытная, дубільная, каніфольная і галянтарэйная вытворчасьці. Сродкі на пабудову новых прадпрыемстваў часткова будуць узяты са зробленых накапленьняў. У выніку індустрыялізацыі, прадукцыя беларускае прамысловасьці павялічыцца да двухсот мільёнаў, колькасьць рабочых павялічыцца ў два разы, заработак узрасьце. На рабочае кватэрнае будаўніцтва будзе выдаткавана восем мільёнаў. Попыт на сельска-гаспадарчую сыравіну ўзрасьце ў два разы, на некаторыя-ж тавары нават у тры разы. Новая прамысловасьць будзе будавацца на аснове рацыяналізацыі, палепшаных умоў працы для рабочых. Гэта павінна будзе значна павялічыць нацыянальны прыбытак Беларусі, узьняць яе на вышэйшую культурную ступень.

У гарадох Беларусі няма хлебазаводаў, халадабойняў і інш.

Проблема пашырэньня новага быту, палепшаньня жыльля, разьвіцьця жаночых, зьнішчэньня антысанітарнага становішча—патрабуе узмоцненага разьвіцьця рабочага кватэрнага будаўніцтва, а таксама будаўніцтва комунальных прадпрыемстваў.

Пяцігадовы плян агульнага будаўніцтва ў гарадох прадугледжвае выдаткі на суму 55 мільёнаў рублёў у акруговых гарадох і 16 млн. у раённых.

Сучасны перэлом у будаўніцтве

дае сурыёзныя пэрспэктывы: кватэрнае будаўніцтва, бясспрэчна, расьце: за мінулыя гады ёсьць дасягненьні ў кватэрнай коопэрацыі на пабудове рабочых пасёлкаў; адбываецца ўмоцнены рост прадпрыемстваў, якія абслугоўваюць будаўніцтва.

ЗЬЕЗДАЎСКІЯ МАЛЮНКІ

„...ХОЦЬ МЫ ЗНОШАНЫЯ, АЛЕ НЕ ДАДЗІМСЯ Ў РУКІ“

Зьезд канчае сваю работу. Ідзе апошняе пасяджэньне пад старшынством т. Чарвякова. Сам дзён працы ня ўтаміла дэлегатаў. Увага напружана. вочы—на трыбуне. Штохвіліна залю асьляпляюць бліскучыя праменьні сьвету з глотак трохногіх юпітэраў кінооператара...

— Так, кажа тав. Чарвякоў, 33 проц. агульнага ліку сяброў нашага новага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту складаюць рабочыя ад варстаку і сяляне ад сахі,—выбачайце, не ад сахі, а ад плугу...

На твары Чарвякова ўсьмешка, а заля гучыць воплескамі...

— Правільна! Далоў саху, даеш плуг!

— Індустрыялізацыя.

* * *

Два бакі ў гэтым зьезьдзе надзвычайна характэрны.

Папершае—прывітаньні.

Літаральна не адбываецца а ні воднага пасяджэньня каб не віталі зьезд інжынэры, фізкультурнікі, сяляне, рабочыя, рабочыя, рабочыя...

Немцы, беларусы, палякі, латышы, літоўцы...

Што гэта азначае?

Гэта характарызуе волю, велічэзную волю рабочых і сялян краіны да згуртаваньня вакол свайго ураду.

Гэта цяпер неабходна больш чым калі, бо...

Падругое:—восьмы зьезд саветаў прашоў пад гаслам надыходзячай ваеннай небясьпекі.

На трэці дзень працы зьезду, у самы разгар спрэчак па дакладу Наркамзему на трыбуне зьяўляецца т. Хацкевіч. Ён апавядаў зьезду пра разгром нашых устаноў у Пекіне.

І жах апанаваў зьезд. І задрыжэла заля пад напорам протэсту усёй краіны...

І калі ля трыбуны зьявіўся кітаец Ван-Чан-Чын, калі ён заклікаў да таго, каб раздавіць імпэрыялістых—заля зьезду задрыжэла ад воплескаў...

У прэзыдыуме зьезду героі грамадзянскай вайны—Фабрыцыус, Цімашэнка, Вастрацоў, Корк.

А на вуліцы Чырвоная армія дае парад Зьезду. Армія здаровая, магутная, адрамантаваная...

— Пораху ў парахаўніцах хапае.

* * *

Два кіты: сельская гаспадарка і прамысловасьць. Вакол гэтых пытаньняў і праходзіць наша праца. І на зьезьдзе гэта асабліва выявілася. Больш за ўсё гаварылі аб гэтым.

І характэрна было тое, што ў прамовы аб будаўніцтве, аб мірнай працы ўрываліся ваенныя мотывы, аддалёныя гранатныя выбухі...

Нам перашкаджаюць працаваць. Нам не даюць магчымасьці займацца мірнай працай. Нас провоцыруюць на вайну.

І правільна сказаў магілеўскі селянін—дзядзька Парцянка:

— Хоць мы зношаныя, але не дадзімся ў рукі... Усе, як адзін, паўстанем на абарону вольнай працы...

Правільна, дзядзька Парцянка!

М. Гр.

Лепшыя ў вытворчасьці

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ПЕРАКЛІЧКА ВОПЫТАМ.

Слова мае Бабруйская комсамолія.

Выклікаем Гомельскую організацыю.

Бярыце прыклад з „Камінтэрнаўцаў"!

Процант бою бутэляк скараціўся з 8-мі да 3-х.—Ваганеткі ня будуць «рабіць прастоі».—Паддзённыя работы пераведзены на зьдзельшчыну, што дала заводу экономію ў сродках.—Высунута на кваліфікаваную працу звыш 30 маладых рабочых

Шкляны завод «Комінтэрн» пасьля капітальнага рамонту пачаў працаваць у лістападзе 1926 г. За гэты час на пашыраных сходах ячэйкі абмяркоўваліся пытаньні гаспадарчага характару: гаспадарчае становішча краіны; адносіны моладзі да вытворчасьці; даклад заводаўпраўленьня. Комсамольцы ў грунтоўным зразумелі пытаньні гаспадарчага будаўніцтва і ужо робяць практычную працу у гэтым напрамку. Ячэйка заслухала справаздачу прадстаўніка ў вытворчую камісію і дала яму указаньні:

«1) **вывучыць задачы і функцыі вытворчай камісіі, 2) вывучыць пытаньне аб боі бутэляк і унесьці свае прапановы у камісію, 3) праверыць, як абстаіць справа з нагрузкай сарціроўшчыц фабрыкатам, а таксама справу нацыянальнага скарыстаньня паддзённай рабочай сілы, 4) унікаць у вывучэньне ўсіх галін вытворчасьці і конкрэтна падрыхтоўваць прапановы на вытворчую камісію**».

У выніку мы бачым такі малюнак.

Процант **бою** фабрыкату (бутэляк) **скараціўся** з 8-мі да трох.

Існаваўшыя раней **паддзённыя работы пераведзены на зьдзельныя**, што дала заводу **экономію ў сродках** і палепшыла якасьць выкананьня працы.

Прынята і будзе хутка праведзена ў жыцьцё **прапанова аб устанаўленьні ў цянульні** (адзін з цэхаў) **электрычнага званку** для падачы сыгналу, каб цягнулі ваганеткі. Да гэтага часу сыгнал падаваўся горлам рабочых, дзякуючы чаму нагляталіся нявытворчыя прастоі ваганетак.

Зараз высунута на кваліфікаваную працу 31 чал. моладзі: 5 майстроў, **19 памочнікаў**, 7 баначнікаў.

С. і Я.

Конкурс на лепшага маладога вытворцу.

(Дражджавы завод „Чырвоны Харчэўнік"),

Юнсэкцыя пры клюбе імя Леніна арганізавала ў сябе на дражджавым заводзе конкурс на лепшага маладога рабочага. Атрымалі згоду ўсіх організацый заводу, організавалі камісію з прадстаўнікоў адміністрацыі сэкцыі моладзі, комсамольскай і партыйнай ячэйкі і спэцыялістых у колькасьці 7-мі чалавек.

Цэлы месяц з гадзіньнікам, паперай, алоўкам у руках камісія правярала, як моладзь працуе: якасьць працы, дысцыпліны на вытворчасьці і г. д.

Зацікаўленасьць да конкурсу з боку моладзі і дарослых рабочых была вялізарная.

Рабочыя гаварылі: чаму гэты конкурс стварылі толькі сярод моладзі, а не сярод усіх рабочых?

Моладзь энэргічна працавала. «Каб не застацца у апошнім ліку». І трэба адзначыць, што гэтая энэргія працы засталася у іх і па гэты час.

Камісія, правяраўшы працу моладзі на вытворчасьці, выявіла, **што бранявік пры сэпаратары тав. Урэцкі ў працягу палугода ўявіў кваліфікацыю і працуе самастойна побач з іншымі сэпаратаршчыкамі. Работніца Марголіна ў працягу 10 хвілін чацьвёркамі ўпакавала 20 фунтаў драждэй, а бранявік Баскіна гэтую колькасьць з лепшай якасьцю ўпакоўкі ўпакавала ў 9 хвілін.**



Выявілі, што з боку некаторай часткі моладзі маюцца прагулы, спазьненьні, дрэнныя посьпехі ў кваліфікацыі, «пажляваецельскія» адносіны да працы.

Гэты конкурс прымусіў моладзь падцягнуцца ў працы. Камісія, вывучыўшы кожнага маладога рабочага, паказала на яго недахопы, як іх можна зьнішчыць.

Конкурс можна праводзіць на кожным мізэрным прадпрыемстве.

Быў адзін недахоп у праведзеным конкурсе: **ня быў організованы конкурсны вечар**, дзе-б абвясьцілі аб выніках. Вінаваты ў гэтым гаспадарчыя органы, якія абяцалі даць грошы на прэміі лепшым маладым рабочым па вытворчасьці, але ня далі.

Яндульскі.

Сшытак, які шмат аб чым гаворыць.

(Ячэйка Махорачнай фабрыкі).



Працуе на фабрыцы 60 рабочых. Комсамольцы ў вытворчым жыцьці прымаюць актыўны ўдзел. Сярод моладзі зьнішчаны прагулы, наведваюць вытворчыя нарады заўсёды, каля 20 комсамольцаў.

Ячэйка мае вучот сваёй працы ў вытворчых нарадах, заведзены сшытак, у які запісваецца кожная вытворчая нарада: колькі прысутнічала комсамольцаў і што яны прапанавалі.

Сьцяпанаў.

ГІСТОРЫЯ ТРОХ ПЛЯНАЎ.

225,6 і „скарачэньне штатаў" пытаньняў.

ВОПЫТ ВІЦЕБСКАГА АКРУГКОМУ ЛКСМБ.

Пляны камітэту і іх зьмест маюць вялікае значэньне ў сыстэме кіраўніцтва. З вопыту нашай організацыі можна адзначыць тры характэрных пэрыоды стварэньня плянаў.

Спачатку: „узмацнялі", „паглыблялі", „вывучалі"...

Плян нашага акруговага камітэту з 1-га лютага па 1-га красавіка 1926 г. займае **13 друкаваных старонак** і зьмяшчае ў сабе **225 асобных пытаньняў**.

Кожны аддзел у пачатку свайго пляну высоўваў асноўныя задачы па плянавы пэрыод. Так, напрыклад: оргаддзел запісаў: «Асноўнай задачай плянавага пэрыоду зьяўляецца практычнае праламленьне рашэньняў 8-га Усебеларускага і акруговага зьезду КСМ, выходзячы з гэтага галоўным момантам працы павінна быць: 1) ажыўленьне ўнутрысаюзнай дэмократыі, 2) працягваньне росту і замацаваньне яго, 3) ўзмацненьне і паглыбленьне працы ячэек, 4) павялічэньне парт'ядра і ўзмацненьне парткіраўніцтва і г. д.

Затым ідуць «конкрэтныя» пункты пляну: **«Узмацніць уцягненьне ў партыю актыва». «Дабіцца выкананьня курсу—сакратар комсамольскай ячэйкі партыец». «Узмацніць сувязь з цэхавымі ячэйкамі». «Вывучыць пытаньне»** і г. д.

Той-жа малюнак мы маем у пляне АПА і іншых аддзелаў. «Палепшыць унутраную пастаноўку політшкол». «Прадоўжыць працу па разбраеньню перарасткаў» і г. д.

Потым: „у габінэтах выседжвалі выніні"...

На кастрычнік і сьнежань мінулага году мы складалі плян у іншым выглядзе. **Ён складаўся з 6-ці старонак і мяшчаў у сябе 96 пытаньняў.**

Плян быў створан увесь з пункту погляду праверкі дырэктыў і падвядзеньня вынікаў працы. Такіх **пытаньняў было каля 50.**

Усе гэтыя пытаньні АК мог прапрацаваць толькі на аснове матар'ялаў РК, а таму і павінен быў даслаць па ўсім гэтым пытаньням адносіны ў раённы камітэт. Райкомы, каб даць матар'ял у акругком, павінны былі падвесьці вынікі ў сябе і таму яны папершае: адбівалі плян акругкому (некаторыя зусім яго не складалі, а працавалі па пляну АК) і падругое, «засыпаліся» тымі-ж запытаньнямі ячэек. Ячэйкі, ў сваю чаргу, адбівалі пляны РК і пачалі ставіць такія пытаньні, як: **«Вынікі** росту», **«вынікі** грамадзкай працы», **«вынікі** працы сярод беднаты» і г. д.

Такім чынам няўмелае складаньне пляну акругкому прывяло да таго, што 1) уся організацыя занялася зусім лішняй мёртвай працай—падвядзеньнем вынікаў, адцягнулася ад жывой конкрэтнай справы; 2) пацягнулася веразіца папер ад АК да ячэек і назад; 3) работнікі АК і РК замест жывога кіраўніцтва працы заселі ў «габінэтах», каб «пісаць вынікі»; 4) актыў у выкананьні пляну ня ўцягваўся; 5) сыстэма працы абсалютна не спрыяла вывучэньню і распаўсюджваньню вопыту.

Плян гэты ў выніку быў выканан менш чым на 50 процантаў і якасьць распрацованых матар'ялаў не зьмяшчала і 50 проц. патрэбнага.

... І толькі цяпер узяліся за практычную працу.

Плян АК на сакавік—май месяцы 1927 году высоўваюць перад організацыяй 6 асноўных пытаньняў. **Гэтыя 6 пытаньняў у конкрэтнай іх прапрацоўцы разьбіваюцца на 26 асобных пунктаў,**

У пляне няма ніводнага агульнага пытаньня. Замест «падвядзеньня вынікаў удзелу у гаспадарчым будаўніцтве» маюцца такія пытаньні, як: даклад 2-га гарадзкога РК аб удзеле фабрычна-заводзкой ячэйкі ў вытворчым жыцьці, даклад Сеньненскага райкому аб удзеле ячэек у пад'ёмцы сельскай гаспадаркі. Замест агульнага пытаньня аб становішчы культурна-масавай працы, на бюро АК ставяцца даклады 1-га гарадзкога райкому аб організацыі досугу моладзі і даклад па гэтаму-ж пытаньню Віцебскага вясковага райкому. Замест дакладу прадстаўніка ў саюз, аб усёй яго працы—ставіцца даклад аб становішчы вучнёўства і прымяненьні програм на прадпрыемствах гэтага саюзу.

Мэтод прапрацоўкі пытаньняў зусім іншы. **Усялякія абсьледваньні ў горадзе праводзяцца праз камісіі з уцягненьнем радавых сяброў АК і нізавога актыву. Пытаньні, якія распрацоўваюцца ў АК, выносяцца раней на абмеркаваньне нізавога актыву. Да вывучэньня асобных пытаньняў, як, напрыклад, вучнёўства, прыцягваюцца спэцыялістыя (інжынэры, майстры). Замест дырэктыў, у плян унесена вывучэньне і распаўсюджваньне вопыту па асобным конкрэтным пытаньням.** Разьмяркаван тэрмін выкананьня пытаньняў і ўказана, каму даручаецца.

Замест «вынікаў наогул» АК цяпер займаецца вывучэньнем асобных конкрэтных пытаньняў і вопыту працы. Паколькі даклад райкомаў ставіцца па конкрэтным пытаньням, забясьпечваецца конкрэтнасьць дырэктыў. Тут даецца магчымасьць працаўнікам менш сядзець у габінэтах і «выседжваць» вынікі, і больш быць непасрэдна ў раёне, у ячэйцы. Працаваць па новаму пляну, па новай сыстэме мы толькі пачалі, але ўжо адчуваецца значнае ажыўленьне.

Ф. Пыканаў.

Комсамолец-студэнт

— Комсамольцы агульна-адукацыйных курсаў хоць і доўга вучылі географію, але ня ведаць дзе... Дняпро. — А вось, комсамольцы гідратэхнікуму пераносяць свае веды ў масы. Яны даюць спраўкі сялянам.

Днепрабуд у... Мазыршчыне.

(Ячэйка ЛКСМБ Менскіх агульна-адукацыйных курсаў).

Была політправерка, як і ўсе політправеркі.

Адны пыталі, другія адказвалі. Здаецца нічога тут дзіўнага няма.

Але уся бяда хаваецца у тым, што «адказвалі».

— Скажы, што гэта за Днепрабуд і у якой рэспубліцы ён?

Пасьля 5-ціхвіліннага раздум'я даецца адказ.

— Днепр цячэ праз Фінляндыю ў Мазыршчыну, значыць Днепрабуд будуецца ў БССР.

— Што гэта за ангельская нота?

— Аб такой рэчы першы раз чую.

— А вось, каля якога гораду будзе Волхаўбуд?

— Ня ведаю, — не саромячыся кажа дзяўчына.

— Якое, значэньне мае зьніжэньне цэн для зарплаты?

— Тое, што хутка пачнуць зьніжаць зарплату рабочым.

Замест слоў «Гоміндан», казалі **«Гоміндант»**; «самаазначэньне»—«самаадукацыя» і г. д.

Усе гэта казалі не комсамольцы якой небудзь глухой, далёкай вёскі, як Мазыршчыны, **а комсамольцы Менскіх агульна-адукацыйных курсаў**, якія праз 2 месяцы канчаюць сярэднюю асьвету і паладуць у вышэйшыя Навучальныя ўстановы.

Усе гэтыя адказы давалі не адзін комсамолец, а цэлых дзесяць, якія былі выкліканы на політправерку. Ніводзін адказ ня быў цьверда ўпэўнены. Ды ён і ня можа быць упэўнены тады, калі хлапцы газэт рэгулярна ня чытаюць. І толькі перад політправеркай прачыталі некалькі нумароў «Звезды».

Да гэтага дадаваць ніякіх тлумачэньняў ня трэба. Але усё-ж такі аб гэтым каму належыць, трэба паклапаціцца.

Як. Шур.

„Турысты".



Куды, ты, ідзеш?

— Ды ў Мазыршчыну, пагледзець, як будуецца Дняпроўская гідростанцыя.

— Га-га-га-га-а-а. Хіба-ж Днепрабуд у Мазыршчыке?

— А дзе-ж? Мне комсамольцы менскіх агульна-адукацыйных курсаў казалі, што ў Мазыршчыне.

Пацалуй у прабой і назад дамоў

Задумаў аднойчы колектыў прабчасу ЛКСМБ яч. БДУ організаваць вечар спайкі з комсамольцамі ячэйкі ФЗВ гарбароў—каб комсамольцаў-студэнтаў прыблізіць да комсамольцаў вытворцаў.

Задумана—зроблена...

Гэтую думку узгаднілі з РК—атрымалі адабрэньне, вылічылі організацыйную камісію.

Апошняя зараз-жа ўзялася за працу.

— Вось толькі трэба паклікаць прадстаўніка ФЗВ,—гаварыў сябра камісіі Райхлін—каб зьмест вечару здавальняў і гарбароў.

— Вось вечар спайкі зробім дык вечар, на ўсяму Менску чутна будзе—адгукнуўся другі.

Сказана—зроблена...

У адзін з дзён тыдню комсамольская ячэйка ФЗВ гарбароў паведамляецца аб жаданьні унівэрсытэцкай ячэйкі.

Усе раптам зашавяліліся. Паслалі прадстаўніка у організацыйную камісію, які зьняўся за час раней з работы, каб сумесна організоўваць вечар спайкі.

Уся ячэйка радасна адгукнулася на добрую справу і ўсе пачалі рыхтавацца да вечару.

Настаў доўга чаканы дзень—па календары ён значыўся 2-е красавіка 1927 году.

Ледзь сонейка засьвяціла, як прачнуўся Раўтовіч (сакратар ячэйкі ЛКСМБ ФЗВ гарбароў) з думкаю аб вечары.

— Эх!—не падкачалі б хлапцы з оркэстрам і выступленьнямі.

У абшчажыцьці БДУ з спакойнай упэўненасьцю аб добра падрыхтаваным вечары бесклапотна, да паўдня спалі ўсе сябры організацыйнай камісіі БДУ сумесна з сакратаром ячэйкі.

Прашло некалькі гадзін. Хлапцы з ФЗВ добра напрацавацца пасьпелі.

... Адгудзеў гудок. Разышліся з заводу хлапцы.

Пачалі зьбірацца на вечар.

Дагаварыліся з струнным оркэстрам, з буфэтам МЦРК уселіся на некалькі падвод і пад гучную песьню «Мы конніца чырвоная»—памчаліся да памяшканьня БДУ на Землякробскі завулак.

Трэба яшчэ адзначыць, што Фабзайцы захацелі паказаць і дарослым рабочым, як у сучасны момант моладзь можа весяліцца—і заклікала шмат старых рабочых на сумесны вечар.

А між тым падводчык усё падганяе ды падганяе свайго захудаленькага коніка—бо не цярпіцца хлапцам—гарбарнікам: «Лепш пачакаць, чым спазьніцца»—казалі яны.

Вось і земляробскі завулак. Вось і будынак унівэрсытэту...

Але што гэта—чаму не гараць агні ў залі—вокна якога выходзяць на вуліцу? Няўжо рана так прыехалі.

Ня маючы вялікага жаданьня паказаць сваю пасьпешнасьць, адзін з хлапцоў пацяху уваходзіць у памяшканьне унівэрсытэту і бачыць замест замка на дзьвярох вісіць маленькая абвестка:

«Вечар сёньня не адбудзецца».

І з плаксівай мінай штохвіліна чытаючы гэтую абвестку, стаіць адзін сябр організацыйнай камісіі Круцелёў П. і кажа хлапцам—праўленьне адмовіла ў памяшканьні кажучы: «памяшканьне Унівэрсытэту існуе дзеля вучобы, а не для гульняў».

Павярнуліся хлапцы «тварам да вёскі» (так яны казалі) і пацяху пачалі садзіцца на падводы, а ў вачох усё міргае афіша, якая не надта даўно была разьвешана на вуглох вуліц. «Сёньня ў актавай залі БДУ вялізны баль і г. д.»

Эх! Сказаў хтосьці з гарбарнікаў — для балю памешканьне маецца, а для сумеснага вечару комсамольскіх ячэек ня...

«Гані да сталоўкі М. І. К. А. ...дык там нагуляем»—крыкнуў другі падводчыка.

Чутна было, як падводчык сьцебануў каня і залескаталі колы.

В. Ляхаў.

Сувязь з домам селяніна

(Менск, Гідратэхнікум)

Ячэйка налічвае 65 сяброў.

Акрамя працы ў самім тэхнікуме ячэйка вядзе не малую працу і ў Цэнтральным Доме Селяніна, там кожны дзень працуюць два комсамольцы. Яны даюць розныя спраўкі і парады селяніну, які прыяжджае ў горад.

Акрамя вышэй адзначанага, ячэйка мае на ўвазе праводзіць адчыненыя сходы ячэйкі ў клюбе Цэнтральнага Дому Селяніна, ставячы на гэтых сходах пытаньні, якія цікавяць сялян.

Міронччык,



Добры сад і агарод павялічыць прыбытковасьць гаспадаркі

Маладыя гаспадары, даглядайце свае гароды так, як раіць агроном!

У бліжэйшыя два гады ўсе сяляне, што жадаюць мець свае сады, змогуць набыць прышчэпы па таннай цане і добрай якасьці.

Гароды і сады павінны даваць больш прыбытку

Мерапрыемствы Наркамзему

Каб сялянскія гароды і сады давалі прыбытак гаспадарцы Народным Камісарыятам Земляробства Беларусі робяцца заходы да паляпшэньня гэтай галіны сельскай гаспадаркі **у межах данага раёну**. Прымаючы пад увагу прыродна-гістарычныя і кліматычныя умовы раёну, **будуць пашырацца належныя пладавыя і гародныя сартымэнты, што палепшыць якасьць агародніны і садавіны, і павялічыць ураджайнасьць.**



Жаданьне селяніна мець свой невялічкі садзік—з кожным годам узрастае. Дзякуючы гэтаму, павялічваецца попыт на пасадачныя матэр'ялы. Для задавальненьня гэтых патрэб, Наркамземам **намечана організаваць па рэспубліцы сетку пладавых пітомнікаў агульнай плошчаю ў 285 гэктараў** (9/10 **дзесяціны) з штогоднай валавой прадукцыяй прывівак у 800.000 штук. Працы па закладцы пітомнікаў ужо вядуцца.**

У сучасны момант па БССР **ужо закладзена 36 пітомнікаў плошчаю ў 205 гэктараў.**

Каб навучыць насельніцтва правільна рабіць пасадку садоў і даглядаць за імі, кожны год па БССР наладжваецца 100 паказальных садоў непасрэдна у вёсках.

Апрача гэтага, у акругах кожную зіму на працягу 2-3 тыдняў **працуюць спэцыяльныя курсы па садаўніцтву і агародніцтву, на якіх займаецца ня менш 25 чалавек.**

У галіне агародніцтва галоўная увага зьвяртаецца на **паляпшэньне тэхнікі апрацовачнай справы.** Для гэтага ў кожным раёне штогодна організоўваецца ня менш, як па адным паказальным агародзе з правільным севазваротам.

Гэтыя мерапрыемствы будуць з посьпехам праведзены ў жыцьцё і дадуць добрыя вынікі, калі само сялянства, асабліва яе актыўная частка—комсамольцы і ўся моладзь будуць усе дасягненьні паказальных агародаў і садоў пераносіць у свае гаспадаркі.

Хабенко

Дзе можна купіць прышчэпы?

У восень гэтага году пладавыя гадавальні Наркамзему будуць выпускаць у першы раз прышчэпы яблынь, груш і г. д.

Сялянам, жадаючым купіць прышчэпкі ўвосень г. г., належыць зьвяртацца непасрэдна ў гадавальнікі. Вось некалькі адрасоў апошніх:

Савецкая гаспадарка Калініна, Самахвалавіцкага раёну, Менскай акругі Саўгаспадарка Блонь, Пухавіцкага раёну, Меншчына.

Акрамя таго, дзеля атрыманьня прышчэпак можна зьвяртацца ў Барысаўскі Агрэмаддзел і Слуцкі Акрсельсаюз.

Аб умовах продажы можна даведацца ў азначаных установах. Дасканалая цана прышчэпак яшчэ не вядома, але ва ўсякім разе будзе ня вышэй аднаго рубля за штуку.

У кожным гадавальніку ёсьць каля 15 гатункаў пладоў, найбольш устойчывых і прыбытковых ва ўмовах БССР. Маюцца антонаўка, штрыфлінг, бабушкіна, наліўное белае, калітоўскае і інш. сарты яблык.

З груш маюцца бэры слуцкія, сапежанкі, вінёўкі і г. д.

Каб атрымаць сёлета прышчэпкі, належыць загадзя ўмовіцца з пладавымі гадавальнікамі.

Змагайцеся з хваробай, змагайце шкоднікаў.

Веснавая праца ў садзе.

У нас на Беларусі садоўніцтва займае **даволі вялікую плошчу і прынясло-б гаспадарцы вялікую карысьць, калі-б не хваробы і шкоднікі.** Вопытны садавод добра ведае сваіх ворагаў, ведае, што палову ураджаю селянін губляе, дзякуючы шкоднікам і розным хваробам.

Шкоднікі ядуць **кветкі, лісты і плады.** Дрэвы робяцца кволымі і ня толькі ў год зьяўленьня шкоднікаў даюць значна меньшы ўраджай, але і ў наступным годзе ня маюць сілы. Шкоднікі ў садзе бываюць кожны год і калі ня весьці з імі барацьбы, яны нашчэнт загубяць сад. Плады, заражоныя грыбнымі хваробамі губляюць сваю рыначную каштоўнасьць. Каб зьнішчыць шкоднікаў, трэба паляпшаць становішча сваіх садоў.

Трынаццаць запаведзяў садавода.

1. Рана вясной дрэвы трэба ачысьціць ад старой кары і моху.

2. Абрэзаць (калі гэта ня было зроблена ўвосень) гальлё, на якіх ёсьць яйкі пярсьцёнкавага шоўкапрада.

3. Паздымаць лісты, якія засталіся з лета, бо на іх ёсьць гнёзды баярышніцы і латагузкі, паздымаць застаўшыяся плады, на якіх ёсьць грыбавыя хваробы.

4. Аглядзець ствалы дрэў: там могуць быць жоўтыя падушачкі яек няпарнага шоўкапрада. Гэтыя кучкі трэба змазаць мешанінай карасіны з дзёгцем.



5. Усё сабранае з дрэў трэба сабраць у кучу і спаліць.

6. Ачышчаныя ад кары ствалы дрэў трэба абмазаць вапнай ці глінай. Нягашанай вапны трэба браць тры-чатыры фун. на вядро вады. Акрамя абмазкі ствала, трэба абпрыскаць усе галіны вапнавым малаком пры дапамозе апрыскваценя.

7. Лепей апрыскаць дрэвы, калі лісты яшчэ не распусьціліся.

8. Аглядзець добра ўсе плады, каб не засталося і там яек ці зародкаў хвароб.

9. На ўсе ачышчаныя і абмазанныя дрэвы трэба налажыць клеявыя паясы навышыні 1—$1\frac{1}{4}$ арш. ад зямлі. Праз гэты пояс не перапаўзуць шкоднікі, як пладажорка і інш. Паясы трэба час ад часу аглядаць і зьнішчаць на іх шкоднікаў. Паясы асабліва патрэбны, калі суседзі не вядуць барацьбы са шкоднікамі.

10. Наступнай працай зьяўляецца перакопка прыствольных кругоў.

11. Разам з перакопкай неабходна пакласьці ўгнаеньне—гной ці мінэральныя парашкі.

12. Калі ў мінулым годзе быў яблавы доўганосік ці кветаед (кветкі не распускаліся, унутры іх быў маленькі чарвячок), то магчыма, што ён будзе і ў гэтым годзе. Гэтых жучкоў трэба страсаць з дрэва, зьбіраць і потым зьнішчаць.

13. Як толькі распусьціліся маладыя лісты, на іх кідаюцца розныя чэрві і адначасова з гэтым пачынаюць сваю дзейнасьць розныя хваробы—парша, гніль, іржа і інш. Адгэтуль зразумела, што вельмі карысна адначасова пачаць барацьбу з усімі шкоднікамі і хваробамі адразу. Загэтым да атруты, якая зьнішчае вусені, дадаюць яшчэ і такую, якая зьнішчае і хваробы дрэў.

Да гэтакіх атрут належаць бардоская жыжка. Калі зьявіліся зялёныя вошы ці тлі, апырскваюць табачным адварам ці зялёным мылам.

Такія працы павінны праводзіцца вясной у садзе.

Мерапрыемствы Наркамзема ў барацьбе са шкоднікамі.

У мэтах найбольш плянавай працы па ахове саду ад шкоднікаў і хвароб, Наркамземам з 1925-26 г. пачалі арганізоўвацца абозы па барацьбе са шкоднікамі. У 1925-26 г. працавала 5 абозаў. У 1926-27 г. будзе працаваць 17 абозаў.

Кожны абоз будзе складацца з 2 апрыскавацеляў Памона, 10 ранцавых апрыскваценяў і неабходнай колькасьці ат-



руты, для правядзеньня чаго запрашаюцца спэцыяльныя працаўнікі. Абозы будуць працаваць у акругах Менскай, Бабруйскай, Слуцкай, Магілёўскай, Віцебскай, Гомельскай і Рэчыцкай. У іншых акругах таксама ёсьць апрыскваценлі і атруты, якімі сяляне могуць карыстацца.

У 1924-25 г. было абслужана 1672 дзес. саду, у 1925-26 г. 2059,5 дзес., а ў 1926-27 г. мяркуецца абслужыць каля 4000 дзес.

Абозы працуюць на землях сялян бясплатна і толькі з гаспадароў зямлі непрацоўнага карыстаньня бярэцца плата.

Кожны селянін можа пазбавіцца ад шкоднікаў і хвароб расьлін захаваць свой ураджай. Для гэтага ён павінен зьвярнуцца да агронома, да інструктара.

Посьпех у гэтай працы будзе залежаць ад самаго насельніцтва, ад таго, які ўдзел яно будзе прымаць у гэтай працы.

З. Сяргеева-Булаўка.



ШТО РАБІЦЬ, КАБ БЫЎ ДОБРЫ ГАРОД

Месца для гароду

Месца для гароду выбіраецца нізкае, роўнае і, абавязкова, сонечнае. Зямля павінна быць сугліністая, перагнойная, у крайнім выпадку, супескавая.

Выробленьне глебы гароду можа быць ручное, пры дапамозе рыдлёўкі, або коннае (у залежнасьці ад велічыні гароднага вучастку). Ручная апрацоўка каштуе даражэй, але затое лепшая, чым другая. Глыбокую перакопку гароду (на глыбіню 8 вярш.) трэба рабіць увосень, зараз-жа пасьля ўборкі гародніны. Калі верхняя, угноеная зямля мае тонкі слой, яе трэба паглыбляць паволі у працягу 3—4 год, каб адразу ня вывярнуць шмат няўгноенай і кепскай зямлі. Вясною, як толькі абсохне зямля, трэба вырабіць зямлю гароду у другі раз. Робіцца гэта на глыбіню да 4 вяршкоў і зараз-жа забараноўваецца, каб зямля надта ня сохла.

Галоўным матэр'ялам для ўгнаеньня гароду зьяўляецца гной жывёлы і кампост. На цяжкай і сырой зямлі гной трэба класьці восеньню, адначасна з апрацоўкай гароду; уворваюць гной ня глыбей 4 вяршкоў. Гною кладзецца па пуду на кожную квадратную сажань. На лёгкіх глебах класьці гной трэба—вясною і па $1\frac{1}{2}$—2 пуды на кожную квадратовую сажань. Гной, які ўжываецца для ўгнаеньня гароду, трэба браць перапрэўшы і перамешаны з зямлёю.

Угнаеньне з кампосных куч трэба класьці вясною, перад пасевам насеньня або пасадкай расады. Пры пасадцы расады, капусты і інш. расад, лепей за ўсё класьці кампост у раўкі, якія зроблены для расьлін (1—2 жмені); пры пасеве насеньня, яго можна пасыпаць у баразны ці рассыпаць па паверхні град у 1—4 варш. таўшчынёю, а потым граблямі зьмяшаць з зямлёю.

Грады і як іх рабіць?

Грады на гародзе робяць для таго, каб карэньні расьлін мелі больш цяпла ў глебе, каб у глебе было менш вільгаці, для павялічэньня таўшчыні глебавага пласту і для таго, каб было зручна даглядаць за расьлінамі.

Каб дасягнуць усяго гэтага, грады трэба рабіць на цяжкіх і вільготных глебах вышынёю ў 6 — 8 вяршкоў, з пакатымі бакамі; на сухіх-жа гле-



бах грады лепей рабіць нізкія, амаль што за адным узроўнем з паверхняй глебы. Грады робяцца ў даўжыню да 15 мэтраў, у шыркі 2 мэтры. Напрамак град—на роўным месцы лепей рабіць з поўдня на поўнач або з усходу на паўночны захад. Дзякуючы такой пабудове град, расьліны ня будуць запямняць друг дружку і будуць раўнамерна ў працягу ўсяго дню асьвятляцца сонцам. На пахілай мясцовасьці, напрамак град робіцца ня ўздоўж, а ў поперак. Паверхня град павінна быць па магчымасьці роўная, каб дажджавая вада даўжэй была на градзе і ня зьбягала.

Севазварот на гародзе.

Практычныя гаспадары заўважылі, што качанная капуста, салата, гуркі, бручка і пятрушка добра растуць толькі на сьвежай і ўгноенай зямлі. Буракі, морква, рэдзька, радыска, тамата, цыбуля і часнок—лепей растуць на глебе, якая ўгноена ў мінулым годзе. Гарох, фасоль і бабы добра родзяць на глебе, якая ўгноена 2 гады таму назад. Заўважана, што на расьліну робіць добры ўплыў частая зьмена месца іх на гародзе. Дзякуючы гэтаму, на расьлінах бывае менш грыбковых хвароб. Гарод хутка ачышчаецца ад сьмецьця. Заўсёды трэба мець ва ўвазе гэтыя асаблівасьці расьлін, чаму на гародзе патрэбна мець севазварот. Лепшым севазваротам для Беларусі трэба лічыць трохпольны. Уводзіць яго можна па рознаму. Але мы раім рабіць гэта такім спосабам: увесь гарод разьбіць на тры роўных вучасткі, а ўсё гародныя расьліны на 3 групы. **Першая група—качанная капуста, салат, бручка, гуркі і пятрушка; другая—буракі, морква, рэпа, рэдзька, радыска, таматы, цыбуля і часнок; трэцяя—гарох, фасоля і боб.**

У першы год працы па севазвароту трэба ўгноіць усе тры вучасткі гароду і на адным пасадзіць першую групу расьлін, на другім—другую, на трэцім—трэцюю. На другі год трэба ўгноіць толькі трэці вучастак, на якім у мінулым годзе былі расьліны трэцяй групы і пасадзіць на ім першую групу расьлін, якая патрабуе сьвежага ўгнаеньня, расьліны другой групы пасадзіць на тым вучастку, дзе ў мінулым годзе была першая група расьлін, а расьліны трэцяй групы,—на месцы расьлін другой групы. На трэці год трэба зрабіць таксама. Такім чынам, гной кладзецца на адзін вучастак гароду, а іменна: на той, які аслабаняецца з-пад расьлін першай групы. Па сьвежым угнаеньні зьмяшчаюць расьліны першай групы, на другі год ідуць без угнаеньня расьліны другой групы; на трэці год таксама без угнаеньня —расьліны трэцяй групы.

Пры такім севазвароце, папершае, гною выходзіць менш у тры разы; падругое, гной выкарыстоўваецца лепш; патрэцяе, расьліны разьвіваюцца вельмі добра і пачацьвертае, гарод ачышчаецца ад сьмецьця і некаторых грыбных расьлін (капустная кіла).

Пасеў гароднага насеньня

Пасеў лепей за ўсё рабіць радкамі, ён палягчае догляд за расьлінамі. Высяваецца насеньне ў баразны, глыбіня баразны на лёгкіх глебах павінна быць $1\frac{1}{2}$ вяршкі, а на цяжкіх і вільготных ня больш 1 вяршка. Насеньне капусты, бручкі, рэпы, салаты, рэдзькі, радысы, гароху, фасолі, бабоў трэба высяваць сухімі. Насеньне гуркоў, гарбузоў, цыбулі, буракоў, морквы, лепей мачыць у вадзе 1-3 дні, каб яны набраклі і хутчэй пачалі расьці.

Перш за ўсё трэба высяваць насеньне пятрушкі і морквы. Праз некалькі дзён трэба сеяць буракі, рэдзьку, радыску, рэпу, салату і інш. расьліны. Яшчэ пазьней высяваецца фасоля. Гуркі і гарбузы трэба высяваць апошнімі.

Як зрабіць капустны рассаднік.

Лепшым месцам для рассадніка лічыцца: высокае, сухое і сонечнае месца, якое абаронена з паўночнага і усходняга боку будынкамі або плотам. Часта даводзіцца рабіць рассаднік падобны да высокай градкі, бакі якой абкладаюцца дошкамі або бярвеньнем. Яшчэ можна рабіць рассаднік на стаўбох. У зямлю трэба ўкапаць 4 моцных стоўбікі і на іх зрабіць памост. На памосьце робіцца з дошак або хмызьняку кош (скрынка). Вышыня рассадніка павінна быць ня больш 2 арш. Як толькі пацяплее, у рассаднік насыпаць добрай дзярновай зямлі, разраўняць не на ўсім рассадніку і заставіць яе на 2-3 дні, каб зямля крыху ўлягласяі і прагрэлася сонцам.

Высяваць насеньне лепей ў радкі на 2-3 вяршкі адно ад другога і закопваць яго дробнай зямлёй праз рэшата, але ня вельмі глыбока. Калі зямля рассадніка вельмі сухая, то яе зараз-жа трэба паліць вадою.

Як толькі насеньне дасьць па 2 заправдных літкі, іх трэба прапалоць так, каб расьлінка ад расьлінкі ў раду сядзела на адлегласьці 2-2 з паловаю вяршкоў. Яшчэ лепей, калі расьлінку можна перасадзіць у другі рассаднік. Саджаць трэба ў радкі на 3 вяршкі радок ад радка і на 2 з паловаю вяршкі расьлінка ад расьлінкі. У кожнай расьлінцы пры пасадцы трэба адшчыкнуць кончык карэньчыка на $\frac{1}{3}$ яго даўжыні, каб гэтым дапамагчы разьвіцьцю бакавых карэньчыкаў. Зараз-жа за пасевам трэба зрабіць добрую паліўку вадою. Карысна паліваць расаду растворам чылійскай салетры (сталовая лыжка на вядро вады); першую паліўку трэба зрабіць пасьля прапалваньня, або праз 4-5 дзён пасьля пікіроўкі іх; другую—праз тыдзень пасьля першай.



САЮЗНЫЯ НАВІНЫ.

За працаздольнага прадстаўніка

Менскім АК ЛКСМБ разасланы наказаньні ўсім гарадзкім райкомам аб удзеле ў перавыбарчай кампаніі фабзаўмясцкомаў.

Райкомы склікаюць **нарады сакратароў ячэек і экономпрацоўнікоў, на якіх абгаварваецца пытаньне аб удзеле моладзі ў гэтай кампаніі.**

Ячэйкі павінны зьвярнуць увагу на падбор аўтарытэтнага і працаздольнага кадра прадстаўнікоў моладзі ў ФЗВ.

Вопыт скарыстаць

Менакругком комсамолу падвёў вынікі апошняй дапрызыўнай падрыхтоўкі. Адзначана што **комсамольцы-дапрызыўнікі былі своечасова падрыхтаваны да заняткаў на пункце.** Таксама своечасова быў організован колектыў КСМ. Праца колектыву значна палепшылася ў параўнаньні з мінулай дапрызпадрыхтоўкай і гэта садзейнічала лепшаму выхаваньню дапрызыўнікаў.

Перашкаджалі **дрэнныя памяшкальныя умовы**, у якіх нельга была добра разгарнуць працу. Назіраліся моманты недысцыплінаванасьці з боку асобных комсамольцаў.

Вопыт апошняй дапрызпадрыхтоўкі будзе скарыстан у далейшай працы ў гэтай галіне.

У каго лепшая экономпраца?

Рэдакцыя газэты **„Дэр Юнгер Арбэйтэр"** праводзіць конкурс на лепшую пастаноўку экономпрацы ў мястэчковай ячэйцы ЛКСМБ. У конкурсе прымаюць удзел 20 мястэчковых ячэек.

Конкурс даў багаты матар'ял, характарызуючы экономпрацу мястэчковых ячэек, экономічнае становішча мястэчковай рабочай моладзі і г. д.

Гэтымі днямі адбудзецца пасяджэньне конкурснай камісіі, якая прысудзіць адной з ячэек прыз за лепшую пастаноўку экономічнай працы—радые прыёмнік.

Ці трэба яго выключыць?

Газэта **„Юнгер Арбэйтэр"** праводзіць зараз на сваіх старонках цікавую дыскусыю аб тым, якой адказнасьці павінен падлягаць па савецкай лініі комсамолец, бяз ведама якога адбылося абразаньне дзіцяці-сына.

Большасьць ўдзельнікаў дыскусыі выказваюцца за тое, **што такіх комсамольцаў неабходна выключаць з саюзу.**

За добрага коопэратара!

Для таго, каб стварыць кадр коопэрацыйна-пісьменных комсамольцаў, пры Менскім АК ЛКСМБ у пачатку мая адчыняюцца 6-ці тыднёвыя коопэрацыйныя курсы, разьлічаныя на 50 чалавек. На гэтыя курсы, у першую чаргу, будуць прымацца комсамольцы, працуючыя ў коопэрацыі (упаўнаважаныя, сябры коопэрацыйных камісій) і ўжо пасьля—астатнія жадаючыя. Заняткі на курсах будуць адбывацца два разы ў тыдзень па вечарох.

Райкомы павінны шырока паведаміць комсамольцаў аб організацыі курсаў, усяляк дабіваючыся, каб на курсы пайшлі комсамольцы, працуючыя ў коопэрацыі.

Заявы падаюцца праз райком у АПА акругкому. **Тэрмін падачы заявы да 25-га красавіка г. г.**

У тры радкі

○ У ВНУ, рабфаках і тэхнікумах Менску навучаецца сёлета **каля трох тысяч студэнтаў.**

○ **5 тысяч беспрытульных дзяцей** знаходзіцца ў дзіцячых дамох БССР.

○ У гэтым годзе адчыняецца ў Менску **вячэрні рабочы унівэрсытэт.**

○ Гурткі фізкультуры на Беларусі ядналюць у сваіх шэрагах **110.000 фізкультурнікаў.**

У гасьцях у пані бюрократыі.

...А ДАЎЖЫНЯ---ВОСЕМ МЭТРАУ

На што трацяцца дзясяткі тысяч

Ртутная мазь, як вядома, надзвычайна добра дапамагае супроць звычайнага зуду. Але вось, што датычыцца зуду пісацельскага—дык тут навука яшчэ нічога ня можа зрабіць... Пэрсідзкі парашок у адзін момант зьнішчае цэлыя арміі клапоў. Але супроць бюрократаў няма яшчэ ў нас такога пэрсідзкага парашку. Бюрократ жыве сабе-пажывае і займаецца «карыснай дзейнасьцю»...

* * *

Наркамсьветы. Самая культурная установа. Але паглядзіце на анкеты гэтай установы... Галава ідзе ходарам!

12 формаў справаздачнасьці па адным толькі організацыйным справам! Дзесяткі тысяч пытаньняў...

Бязумоўна, таварыша, які працаваў над гэтымі формамі, аж пот прашыб... Калі мы падлічылі, колькі квадрацікаў у гэтых формах (кожны квадрацік павінен быць запоўнен), дык дакаціліся да ліку... 65 тысяч!!! Вось гэта—так! Гэта, можна сказаць, размах...

Калі сакратар Бабруйскага акрана атрымаў гэтыя формы, ён, напэўна, самлеў... Ва ўсякім выпадку ён напісаў наступную паперку ўпаўнаважанаму РСІ і ЦКК:

— „У мінулым вучэбным годзе апарат **акрана налічваў 5 тэхнічных працаўнікоў...** У гэтым-жа годзе працуюць толькі два—я і кіраўнік справамі... Цяпер кіраўнік справамі зрабіўся рэгістратарам, а я... я запаўняю анкеты... Гэта нешта жудаснае—гэтыя анкеты... Даклады адзін за другім—у акрвыканком, Гарсавет... І якія вялікія! **Адна справаздача ў Наркамасьветы налічвала 571 граф. 265 аддзелаў, даўжынёю ў 8 мэтраў і весам у 2 з палов. фунты...** Каб запоўніць яе, патрабавалася **цэлых 3 месяцы.** Гэту справаздачу мы складалі па грунце 473 гадавых справаздач асобных школ... Можна сябе ўявіць колькі тут працы... Я з кіраўніком справамі літаральна топімся ў паперах... Я прашу зьняць з мяне адказнасьць.

Упаўне зразумела, чаму пішуцца такія паперкі. Досыць толькі пагледзець на гэту груду шэрай паперы, каб пераканацца ў тым, што сакратар Бабруйскага акрана сапраўды ня можа працаваць... І горш усяго, што гэтыя бясконцыя пытаньні часта пазбаўлены сэнсу, зьяўляюцца рэзультатам бюрократычнай [illegible] мкі.

Трэба памятаць, што на ўсе гэтыя справаздачнасьці **трацяцца дзясяткі тысяч дзяржаўных грошай.**

* * *

У папках РСІ можна ўгледзіць шмат прыкладаў такіх вось анкет... Наркамасьветы па часьці справаздачнасьці не адзіны ў нас. У нашых установах да гэтых часоў яшчэ ня зьнішчана канцэлярская валакіта.

Трэба задушыць гэту 8-мэтравую паперовую вужаку!

Мы за:

— **рацыяналізацыю, мэтазгоднасьць і галаву на плячох!**

М. Грузінаў.



На трэці паверх

Тав. **Лучонак**, рабочы Беларускага Вандроўнага Тэатру Галубка, — бядняк, мае поўдзесяціны зямлі і даўно марыць паступіць вучыцца на рабфак.

Яшчэ два месяцы таму назад ён сабраў адпаведныя спраўкі, склаў іх у прасторнай кішэні сьвіткі і напісаў заяву ў рабфак... Ужо быў упэўнен у тым, што з восені г. г. пачне вучыцца. Выпісаў з Масквы «Рабфак на дому» і старанна ўзяўся за навуку.

Але... тут пачынаецца гісторыя.

У праўленьні рабфаку яму адказалі, што патрэбна камандыроўка ад саюзу; Лучонак на заўтра пашоў у саюз. Сакратар саюзу, разглядаеўшы заяву, адказаў, што ў гэтым годзе камандыровак ня трэба і яму параіў ісьці ў ЦСПСБ. Ён паслухаўся, а ў ЦСПСБ сказалі, што трэба ісьці ў мясцовы камітэт. Ён зноў паслухаўся, а ў мясцовым камітэце сказалі, што яны нічога ня ведаюць і што трэба ісьці зноў у саюз. Ён зноў пашоў у саюз, але там сказалі... напэўна чытачу ўжо абрыдла гэта гісторыя і ён хоча ведаць вынікі пахаджэньня Лучонка.

Вынікі? Калі ласка: **Лучонак** яшчэ і зараз ходзіць ад саюзу ў мясцком, ад мясцкому ў рабфак, ад рабфаку ў ЦСПСБ

Мы пытаем: **хто вінават у гэтым? Чаму цягнуць такую валакіту? Праз цэлы год!**

Спачуваючы.

„Дайце валяр'янкі"

Беспрацоўнаму Сэрману, які пражывае па Пролетарскай вуліцы, зрабілася млосна, пачаліся колікі ў жываце і ён самлеў.

Паляцелі за дапамогай у пажарную каманду—ня сьмейцеся, там быў лячэбны пункт.

Аказалася, што дапамогу дае цяпер толькі Цэнтральная Рабочая Амбуляторыя.

Звоняць па тэлефону:

— Безадкладна прыяжджайце! Чалавек паміраe...

А адтуль халодны, спакойны голас:

— Дайце валяр'янкі...

У адказ на гэта **крык:**

— Вам гавораць, **што чалавек самлеў**, ён хворы, ён з **хвіліны на хвіліну** можа памерці...

І зноў халодны голас прапануе прыбегчы да дапамогі валяр'янкі.

Пасьля доўгіх крыкаў і сьлёз удалося ўламіць доктара Бэрмана, каб ён паехаў паглядзець хворага.

Паехалі. Беспрацоўны Сэрман ня мог устаць. Аказалася, што гэта быў востры прыпадак апэндыцыту.

— Павінна ў такіх выпадках выяжджаць хуткая дапамога?—запіталіся ў Бэрмана.

— Бязумоўна,—быў адказ.

Але можа ён памыляецца? Тады трэба «даць яму валяр'янкі»...

А. Каліта.

Аўтамашына №...

Ёсьць у Менску палата мер і вагаў. Звычайная невялічкая ўстанова з вялікім штатам. Надумаў загадчык палаты набыць аўтамашыну, ня гледзячы на тое, што яна **ўстанове зусім не патрэбна.**

Ясна, што аўтомобіль купілі (дармо ва ніхто ня дасьць), ясна, што нанялі мэханіка (яна сама ня едзе), ясна, што адбудавалі гараж (ня будзе-ж яна мокнуць), ясна, што нанялі вартаўніка (а што калі яна ўцячэ?) і ясна, што тут плакалі казённыя рубельнікі...

А між тым, машыну скарыстоўваюць ўсяго дзьве гадзіны ў дзень, а ў астатні час яна возіць «зара» па гораду.

Таварыш загадчык! Вы—майстар вылічаць. Калі ласка, падлічыце нам, колькі грошай пайшло на ўтрымальне машыны і наколькі яна патрэбна?

Пешы.



У нас зьніжаны цэны

(Гаркаўскае спажывецкае таварыства «Селянін», Чэрвенскага раёну, Меншчына)

Наш коопэратыў пачаў значна зьніжаць цэны амаль што на ўсе тавары, якія патрэбны селяніну. Напрыклад, соль была 90 к. пуд., стала 66 к., жалеза было фунт 9 к., стала 8 к., цукер быў 33 капейкі фунт стаў 29 к., махорка была 7 кап. асьмушка, стала 6 з пал., мануфактура падзешавела на 5 проц. і шмат іншых тавараў стала—значна дзешавей. Сяляне, бачачы гэту справу, гавораць «**вось гэта добра, цяпер усім трэба ўступаць у пайшчыкі, каб мацнела коопэрацыя, тады яшчэ стане дзешавей**».



Чатыры гадзіны

На вечары бэтговэнскай музыкі



Слухаюць...

Першае, што трэба адзначыць, гэта тое, што ў залі былі ўсяго дзьве-тры лысіны. Адзінокія, яны губляліся сярод віхрастых галоў, касынак і кепак...

Падругое—была цішыня. Цудоўная для такой аўдыторыі цішыня! Бо мы ведаем, як «ціха» бывае на нашых сходах, вечарох спайкі і пасяджэньнях. А тут 4 гадзіны, бяз усякіх папярэджваньняў і просьб існавала самая строгая і самая сьвядомая дысцыпліна... На чатыры гадзіны гэтыя хлопцы і дзяўчаты зьліліся з сучнымі акордамі рояльных сонат, варыяцыямі скрыпкі, віхрам оркэстру. І хто можа цяпер сказаць, што сур'ёзная музыка не патрэбна нашай моладзі? Хто можа сказаць гэта, пасьля таго, як у клюбе імя Карла Маркса сотні менскай рабочай і вучнёўскай моладзі так уважліва, так сур'ёзна і з такім захапленьнем праслухала Бэтговэнскі концэрт?

Калі «Чырвоная Зьмена» апавясьціла аб організацыі ёю вечару Бэтговэнскай музыкі для моладзі, многія папярэджвалі, што тут будзе правал.—Многія казалі, што «наша моладзь ня любіць концэрты - ёй-бы што небудзь палягчэй».

Жыцьцё паказала іншае.

Вечар Бэтговэнскай музыкі, які адбыўся ў аўторак, 12-га красавіка, бязумоўна, прашоў з вялікім посьпехам.

Концэрт быў ня звычайны. Тут не сабраліся для таго, каб усладзіцца прыгожымі звукамі, пабачыць знаемых разыйціся з лёгкім сэрцам... Не. Гэта была сапраўднае спатканьне з Людвікам ван-БЭТГОВЭНАМ, гэта была сур'ёзнае і глыбокае знаёмства з яго геніяльнымі творамі.

Правільную ўстаноўку вечару з самага пачатку даў тав. Дрэйзін. У сваім вельмі цікавым уступным слове ён абмаляваў жыцьцё композытара, пачыньне аб яго творчасьці і тых гістарычных умовах, якія гэту творчасьць узгадавалі.

Маленькі, провінцыяльны Бон, дзе робіць свае першыя крокі Людвік, яго дзіцячыя пакуты, знаёмства з ідэямі французскай рэволюцыі, прыезд у Вену, знаёмства з буйнейшымі музыкамі таго часу, варожыя адносіны да арыстократыі, бурная, пладавітая творчасьць, перамогі і паражэньні, затым пэрыод глухаты, адзіноцтва і стварэньня найвялікшых твораў усіх часоў—усё гэта праходзіла перад вачыма слухачоў.

І калі пачаўся концэрт, аўдыторыя была падрыхтавана і магла ўжо лепш унікаць у тайны музычных сьпляценьняў...

У аддзяленьні камернай музыкі асабліва спадабаліся Лунная соната і квартэт. Астатныя нумары таксама сустрэлі вельмі добра, але тыя былі больш зразумелы, больш блізкі.

Выступленьне сымфонычнага оркэстру таксама прашло надзвычайна ўдала.

Студэнты Беларускага музтэхнікуму паказалі сябе малайцамі.



Ю. Дрэйзін.

Аб тых чатырох гадзінах, якія яна правяла ў аўторак у клюбе Карла Маркса, наша моладзь ня будзе шкадаваць. Бо гэтыя чатыры гадзіны многае далі і аб многім сказалі.

МІЮ.

Організуем масавы турызм

Віцебскім АК ЛКСМБ сумесна з акрсаветам фізкультуры гэтымі днямі была наладжана нарада па пытаньню організацыі масавага турызму моладзі. На нарадзе прысутнічала звыш 50 чалавек. Гаварылі аб тым, што далёкіх экскурсый нам організоўваць ня трэба, а лепей заняцца вывучэньнем гораду Віцебску і яго ваколіц, другія знаходзілі, што стварыць турызм з краязнаўчым ухілам нельга тому, што наша моладзь не дарасла да гэтага, (!?) што лепей «любавацца прыродай».

У асноўным у спрэчках даваліся дзельныя прапановы. Так гаварылі аб тым, каб скарыстаць раку Дзьвіну для турызму, прасунуць турызм у школы, піонэрскія атрады і г. д.

Зьвернута увага на тое, каб з турызму не зрабілі «брадзяжніцтва». Каб папярэдзіць гэта, трэба правесьці падрыхтоўчую кампанію, добра растлумачыць задачы турызму. Выявілася, што **шмат комсамольцаў Віцебскай акругі прымуць удзел у майскай экскурсыі, організаванай газэтай «Чырвоная Зьмена». З аднаго толькі Сураскага раёну ў Ленінград паедуць 70 чалавек.** Нарада ўхваліла організаваць на прадпрыемствах гурткі турыстых, а для кіраўніцтва усёй гэтай працай пры АК ЛКСМБ стварыць бюро турыстых. Былі на нарадзе і так званыя «турыскія пэсімістыя», якія потым організавалі... «масавы турызм» з нарады.

М. Таўбэ.

Што даюць нашы школы?

Заняткі ва ўсіх тэхнікумах, профшколах і школах ФЗВ канчаюцца паміж 15 і 20 мая. Праца выпускных камісій і пераводныя залікі скончацца да 7-га чэрвеня.

Пры ўсіх тэхнікумах, профшколах і школах ФЗВ утвараюцца спэцыяльныя камісіі па правядзеньню выпуску вучняў у складзе: загадчыка школы ці тэхнікуму, аднаго выкладчыка па спэцыяльным прадметам, прадстаўнікоў Акрана, адпаведнага саюзу і ЛКСМБ.

Да часу выпуску прыстасоўваецца **справаздачная кампанія канчаючых школы ФЗВ, профшколы і тэхнікумы перад мясцовым насельніцтвам.** Кампанія будзе праходзіць пад лёзунгамі популярызацыі і пашырэньня профтэхасьветы.

Будуць організаваны спэцыяльныя выпускныя вечары і выстаўкі асьвятляючыя працу вучняў.

АДКАЗЫ ЧЫТАЧАМ.

ЮЗЬВІКЕВІЧУ (№ 900) Райком ЛКСМБ можа кожнага комсамольца перакінуць для працы ў другую ячэйку. Калі-ж ты лічыш, што гэта можа пашкодзіць тваёй гаспадарцы, дык падай апэляцыю ў акругком.

ГАРОШКАВУ (№ 901) Вучні сямігодкі пры паступленьні ў тэхнікум павінны трымаць экзамін.

Р. М. (№ 902) Кандыдат, які пераводзіцца ў сябры КСМ, павінен таксама мець два паручыцеляў.

КЛІМОВІЧУ (№ 903). Не абавязкова, каб правадыр атраду ўваходзіў у вучком.

КОМСАМОЛЬЦУ (№ 904) Свеі дакумантаў можна заберыць у канцэлярыі Нарсуду ці ў Райвыканкоме.

Апавяшчэньні

Менакругкому ЛКСМБ

30-га красавіка 1927 году а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу „КІМ" Менакругком ЛКСМБ склікае **нараду актыву вытворчых ячэек з наступнай павесткай дню:**

1) Даклады ячэек заводу „Энэргія", МШВ і заводу дрэваапрацоўчнікаў. 2) Аб удзеле комсамольцаў у працы па рацыяналізацыі вытворчасьці. 3) Інформацыя аб усебеларускім конкурсе.

На нараду выклікаюцца: **усе сябры і кандыдаты бюро вытворчых ячэек, прадстаўнікі ў фабзаўмясцкомы і ЦЛ Профсаюзаў.**

* * *

У суботу 16-га красавіка, а 6-й гадзіне ўвечары, у клюбе „КІМ" адбудзецца **першая вузлавая конфэрэнцыя чыгуначнай рабочай моладзі гораду Менску з наступнай абвесткай дню:**

1) Даклад аб працы вучпрофсача сярод рабочай моладзі Заходняй чыгункі. 2) Даклад аб становішчы школы МШВ МББ чыгункі. 3) Далейшая экономічная і культурная праца.

Дэлегаты на конфэрэнцыю атрымоўваюць мандаты ў вучпрофсачах.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Часовае пасьведчаньне за **№ 667**, выд. Мен. АК ЛКСМБ **Сьвірыду.**

— Кандыдацкая картка за № 527, выд. Мен. АК ЛКСМБ **Аніску.**

— Сяброўскі білет за № 42829, выд. Мен. АК ЛКСМБ **Іванову.**

— Часовае пасьведчаньне за № 158, выд. Мен. АК ЛКСМБ т. **В. Куніцкаму.**

— Часовае пасьведчаньне, выд. Мен. АК ЛКСМБ т. Эд. Галубку.

— Сяброўскі білет № 2250, выд. Слуц. АК ЛКСМБ т. Р. Казлу.

— Сяброўскі білет № 34891 выд. Слуц. АК ЛКСМБ т. Я. Радзюкевічу.

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867, Менск, 2 друкарня БДВ.